Слаўся, Айчына ты наша свабодная!

Голас Радзімы

ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАЙ СЕКЦЫІ КАМІТЭТА ЗА ВЯРТАННЕ НА РАДЗІМУ І РАЗВІЦЦЁ КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЕЙ З СУАЙЧЫННІКАМІ

№ 97 (582) | Снежань 1961 г. | Год выдання 7-ы

ВЕСТКІ З РОДНЫХ МЯСЦІН

Калектыў Лідскага завода сельскагаспадарчага машынабудавання выпускае штодзённа амаль у сем разоў больш паўнавясных касілак-здрабняльнікаў, чым у гэты час у мінулым годзе. У паўтара раза перавыкананa заданне па выпуску запасных частак да розных сельскагаспадарчых машын. Выраблены доследныя ўзоры універсальнага бульдозера і навяснога бульбакапальніка.

✦

У калгасе «Камунар» Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці пачаў працаваць новы добраўпарадкаваны клуб. У ім вялікая глядзельная зала, пакоі для работы харавых, танцавальных і іншых гурткоў мастацкай самадзейнасці. Зараз у вобласці налічваецца звыш тысячы клубаў, палацаў і дамоў культуры.

✦

У Рудзенскай пасялковай бібліятэцы адкрыта выстаўка твораў пісьменнікаў-землякоў. Тут можна азнаёміцца з творчасцю Міхася Чарота, Фядоса Шынклера, Пятра Рунца, Уладзіміра Хадыкі і іншых.

✦

У калгасе «Партызанскі край» Старобінскага раёна за апошнія гады асушана 2 тысячы 620 гектараў балот і малапрыгодных угоддзяў. Зараз тут вырошчваюць добрыя ўраджаі.

✦

Сельскія працаўнікі рэспублікі атрымалі сёлета 13 новых электрастанцый, 64 клубы і 6 тысяч жылых дамоў. Новыя добраўпарадкаваныя вуліцы паявіліся ў калгасе «Перамога» Талачынскага раёна, у саўгасе «Рось» Іўеўскага раёна, у калгасе «Сямігодка» Ваўкавыскага раёна і інш.

✦

Пяць новых школ адкрылася ў гэтым годзе ў Маларыцкім раёне Брэсцкай вобласці. Зараз тут працуе 57 школ.

✦

У вёсцы Дамжэрыцы Лепельскага раёна адкрыта ўчастковая бальніца, дзе калгаснікі атрымліваюць бясплатную медыцынскую дапамогу. У ёй абсталяваны хірургічны, тэрапеўтычны кабінеты, лабараторыі. У раёне расшыраецца сетка медыцынскіх устаноў. У вёсках Суша, Замошша адкрыты акушэрскія пункты. Завяршаецца будаўніцтва амбулаторыі ў вёсцы Краснаўкі. Бальніцы аснашчаюцца навейшай медыцынскай апаратурай.

✦

Дваццаць выпускнікоў сярэдняй школы вёскі Даўгінава Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці паступілі ў гэтым годзе ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Усе яны выбралі спецыяльнасці, якія найбольш патрэбны роднаму калгасу. Соф'я Буй паступіла ў Гродзенскі ветэрынарны інстытут, яе сяброўкі Вера Бусько і Клаўдзія Самец займаюцца ў заатэхнічным тэхнікуме.

Амаль паўтары тысячы юнакоў і дзяўчат Карэліцкага раёна паступілі за апошнія пяць год у вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы.

✦

Амаль чвэрць стагоддзя выступае перад працоўнымі Гомельшчыны хор сяла Прыбыткі. У яго складзе — працаўнікі палёў, сельская інтэлігенцыя. Кіруе хорам заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР Пятрэнка.

У рэпертуары хору — песні савецкіх кампазітараў, народныя песні, песні зарубежных кампазітараў.

✦

Прадукцыя Рагачоўскага завода малочных кансерваў шырока вядома і карыстаецца вялікім попытам не толькі ў нашай краіне, але і за рубяжом. На выстаўках у Злучаных Штатах Амерыкі, Англіі, Францыі, Бельгіі прадукцыя завода атрымала вышэйшую ацэнку.

✦

Больш за 700 рабочых і служачых Віцебскай фабрыкі «КІМ» правялі свой адпачынак у санаторыях, дамах адпачынку і на турысцкіх базах «Нарач» і «Браслаўскія азёры». 70 працэнтаў кошту пуцёвак аплаціла фабрыка, а каля 200 чалавек адпачывалі бясплатна.

✦

У калгасе «Іскра» Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці ўсе працаёмкія работы механізаваны. У калгасе маецца каля 70 відаў розных сельскагаспадарчых машын.

У Брэсце закончана будаўніцтва новага будынка Дома піянераў. Там ёсць спецыяльная зала для гульняў, глядзельная зала, пакоі для гурткавай работы.

НА ЗДЫМКАХ:
1. Агульны выгляд новага будынка Дома піянераў.
2. Удзельнікі балетнага гуртка ў новым памяшканні.

ФОТАВЫСТАЎКА Ў ХАНОІ

ХАНОІ. Тут у адпаведнасці з пагадненнем аб культурным абмене паміж ДРВ і СССР адкрылася фотавыстаўка Беларускай ССР. Прадстаўленыя на ёй фатаграфіі адлюстроўваюць розныя бакі жыцця Савецкай Беларусі. Многія здымкі расказваюць аб шырокім размаху сацыялістычнага спаборніцтва ў рэспубліцы, аб барацьбе за камуністычнае будаўніцтва. Вялікую ўвагу, паведамляе ВІА, прыцягваюць цудоўныя ландшафты Беларусі.

За незалежнасць, дэмакратыю і мір

Зварот V Сусветнага кангрэсу прафсаюзаў да працоўных усяго свету

Працоўныя мужчыны і жанчыны, прафсаюзы ўсіх краін!

З 4 па 15 снежня 1961 г. у Маскве адбыўся V Сусветны кангрэс прафсаюзаў.

У ім удзельнічала 1.000 дэлегатаў, назіральнікаў і гасцей, якія прадстаўлялі 143 мільёны працоўных мужчын і жанчын 97 краін свету.

На гэтай самай прадстаўнічай у гісторыі рабочай асамблеі разгарнулася шырокае абмеркаванне ўсіх карэнных праблем, якія хвалююць людзей працы ўсіх краін.

У ёй прынялі актыўны ўдзел прадстаўнікі прафсаюзаў сацыялістычных, капіталістычных, нядаўна вызваліўшыхся ад каланіяльнай эксплуатацыі і каланіяльных краін.

V Сусветны кангрэс прафсаюзаў прыняў праграму дзеянняў прафсаюзаў на сучасным этапе ў абарону інтарэсаў і правоў працоўных.

За гады, што прайшлі з часу IV Сусветнага кангрэса прафсаюзаў, рабочы клас дабіўся новых, выдатных перамог у сваёй мужнай барацьбе за жыццёвыя інтарэсы працоўных, супраць імперыялізму, за мір і сацыяльны прагрэс.

V Сусветны кангрэс прафсаюзаў пераканаўча пацвердзіў, што, як паказваюць гісторыя і факты, наступіў час, калі рабочы клас, разам са сваімі натуральнымі саюзнікамі, можа станоўча вырашаць праблемы, якія стаяць у цяперашні час перад чалавецтвам.

Кангрэс вітаў поспехі ў будаўніцтве новага жыцця, атрыманыя працоўнымі і прафсаюзамі сацыялістычных краін, якія прадстаўляюць трэць чалавецтва.

У Савецкім Саюзе пачата ажыццяўленне грандыёзнай Праграмы, якая дазволіць на працягу дваццаці гадоў стварыць матэрыяльна-тэхнічную базу камунізма.

Мы ацанілі непераадольны рух уперад сацыялістычных краін, як рашаючую характэрную рысу нашай эпохі.

V Сусветны кангрэс прафсаюзаў вітаў магутны рух і грандыёзную нацыянальна-вызваленчую барацьбу прыгнечаных народаў, якая ўзрушыла асновы каланіяльнай сістэмы; у выніку гэтай барацьбы за перыяд, што прайшоў з 1957 года, 22 краіны дабіліся сваёй нацыянальнай незалежнасці. У гэтым шырокім руху прафсаюзы працоўных, аб'яднаўшыся з усімі нацыянальнымі сіламі, адыгрывалі і адыгрываюць першарадную ролю.

Удзел у V Сусветным кангрэсе прафсаюзаў прадстаўнікоў рэвалюцыйнай Кубы, якая будуе сацыялізм, быў натхняючым для ўсіх прысутных на кангрэсе; мы абяцаем абараняць яе ад любой імперыялістычнай агрэсіі.

Кангрэс вырашыў зрабіць усё, каб дабіцца неадкладнага міру ў Алжыры шляхам прызнання яго нацыянальнай незалежнасці на базе тэрытарыяльнай цэласнасці.

Кангрэс заклікае вас аб'яднацца і змагацца за ліквідацыю каланіялізму і неакаланіялізму.

Дзякуючы магутнаму ўздыму адзінай барацьбы працоўных мас у капіталістычных краінах штогод усё новыя мільёны працоўных уліваюцца шырокім патокам у барацьбу за задавальненне эканамічных і сацыяльных патрабаванняў. Часта яны атрымліваюць значныя перамогі ў барацьбе супраць капіталістаў, супраць манаполій.

У ходзе гэтай барацьбы, якая вядзецца ва ўсім свеце, вызначаюцца агульныя для вас асноўныя патрабаванні:

— Абарона і ўмацаванне міру, вырашэнне спрэчных міжнародных праблем мірнымі сродкамі: шляхам перагавораў і, у першую чаргу, шляхам заключэння мірнага дагавору з абедзвюма германскімі дзяржавамі і нармалізацыі становішча ў Заходнім Берліне, які павінен стаць свабодным, дэмілітарызаваным горадам.

— Ліквідацыя ўсіх іншаземных ваенных баз на тэрыторыі іншых дзяржаў.

— Барацьба супраць адраджэння заходнегерманскага і японскага мілітарызму, за анулявання япона-амерыканскага дагавору.

— Мірнае суіснаванне паміж краінамі з розным эканамічным і сацыяльным ладам.

— Усеагульнае і поўнае кантралюемае раззбраенне і неадкладнае спыненне тэрмаядзерных выпрабаванняў.

— Развіццё дэмакратыі і барацьба супраць усякіх спроб вяртання да рэакцыі і фашызму.

— Абарона эканамічных і сацыяльных патрабаванняў.

Працоўныя мужчыны і жанчыны ўсяго свету!

Кангрэс заклікае вас аб'яднацца і змагацца за задавальненне гэтых агульных патрабаванняў. Аб'яднацца і змагацца супраць падрыхтоўкі новай вайны, якую вядуць сілы імперыялізму на чале з амерыканскім імперыялізмам.

Працоўныя мужчыны і жанчыны, прафсаюзы ўсіх краін!

V Сусветны кангрэс прафсаюзаў лічыць вырашэнне праблемы адзінства асноўнай задачай.

Гэты кангрэс з'явіўся сімвалам палітыкі адзінства, якую праводзіць Сусветная федэрацыя прафсаюзаў.

Адзінства дзеянняў працоўных няспынна развіваецца. Вы аб'ядноўваецеся на ўсіх прадпрыемствах: усюды, дзе вы працуеце.

З абвастрэннем класавай барацьбы ўсё больш шырокія масы рабочых уцягваюцца ў барацьбу, якая патрабуе адзінства.

Кіраўнікі і арганізацыі, якія супраціўляюцца ажыццяўленню адзінства, часта бываюць вымушаны адступаць пад вашым націскам.

Адзінства неабходна працоўным.

У расколе зацікаўлены толькі капіталісты.

Працоўныя ўсіх краін, члены ўсіх прафсаюзных арганізацый!

Вы з'яўляецеся велізарнай сілай, і гэта сіла несакрушальная, калі вашы рады згуртаваны, калі вы выступаеце адзіным фронтам у барацьбе за вашы жыццёвыя інтарэсы, дэмакратыю і сацыяльны прагрэс, за справу міру ва ўсім свеце.

Працоўныя! Рашуча змагайцеся за адзінства. Аб'ядноўвайце ўсе вашы сілы ў барацьбе за дасягнення дабрабыту, свабоды і міру на зямлі, за працвітаючую будучыню для ўсяго чалавецтва.

Працоўныя!

Зыходзячы з дыскусіі, якая праходзіла на V Сусветным кангрэсе прафсаюзаў, і яго рашэнняў, Сусветная федэрацыя прафсаюзаў урачыста абавязваецца прыкласці ўсе сілы для ажыццяўлення глыбокіх імкненняў да адзінства соцень мільёнаў людзей працы, незалежна ад краін, дзе яны жывуць, іх расы і рэлігіі. Гэта імкненне да адзінства непераадольнае.

Дык наперад жа ўсе разам, натхнёныя верай у будучыя перамогі ў справе будаўніцтва сацыялізма, у барацьбе за незалежнасць, дэмакратыю і мір!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Савецкі народ патрабуе:

Нядаўна Савецкі ўрад звярнуўся да ўрада ЗША з патрабаваннем арышту і выдачы савецкім уладам на падставе міжсаюзніцкіх пагадненняў буйнага ваеннага злачынцы, былога гітлераўскага генерала Адольфа Хойзінгера. Цяпер Хойзінгер з'яўляецца старшынёй пастаяннага камітэта агрэсіўнага Паўночнаатлантычнага блоку (НАТО) ў Вашынгтоне.

Як выявіла Надзвычайная дзяржаўная камісія па ўстанаўленню і расследаванню злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Хойзінгер зрабіў рад злачынстваў супраць міру і чалавечнасці. Ён быў непасрэдным удзельнікам распрацоўкі планаў і падрыхтоўкі агрэсіўных нападаў на Савецкі Саюз, Англію, Францыю, Югаславію, Грэцыю і рад іншых дзяржаў. Па асабістаму ўказанню Хойзінгера на часова акупіраваных тэрыторыях, у тым ліку і ў Беларусі, праводзіліся масавыя знішчэнні мірных людзей — дзяцей, жанчын, старых... Гэта ён, Хойзінгер, арганізаваў расправу над ста жыхарамі ў пасёлку Слаўнае Крупскага раёна, расстрэльваў людзей паміж Асіпоўкай і Аляксандравым, знішчыў 882 чалавекі ў выніку правядзення аперацыі «Франц». Спіс яго крывавых злачынстваў надта доўгі.

Прагрэсіўная грамадскасць усяго свету падтрымлівае патрабаванне Савецкага ўрада аб выдачы ваеннага злачынцы Хойзінгера.

У многіх гарадах і вёсках Беларусі адбыліся масавыя мітынгі працоўных, на якіх выступаючыя горача падтрымлівалі ноту Савецкага ўрада, расказвалі аб злачынствах гітлераўцаў, якія яны рабілі па ўказцы Хойзінгера на беларускай зямлі, і патрабавалі прыцягнуць да судовай адказнасці гэтага забойцу.

Ніжэй мы друкуем выступленні ўдзельнікаў агульнагарадскога мітынгу ў Мінску, справаздачы аб мітынгах у Крупках, Барысаве, Віцебску і Талачыне.

Вось ён, крывавы генерал Адольф Хойзінгер.

★ ★

Вось каму ЗША даручылі распрацоўваць планы вайны

(З выступлення І. ЛЯСКОЎСКАГА, студэнта БДУ імя Леніна)

Увесь свет, усе людзі на зямлі памятаюць, якія незлічоныя пакуты прынесла вайна, што навязалі чалавецтву фашысты. І вось нядаўна Савецкі ўрад апублікаваў новыя неабвержныя дакументы аб злачынствах, зробленых гітлераўскімі галаварэзамі ў час другой сусветнай вайны.

Усім вядома, што пасля разгрому гітлераўскай Германіі было заключана міжнароднае пагадненне аб выдачы ваенных фашысцкіх злачынцаў тым краінам, на тэрыторыі якіх яны зрабілі злачынствы. І тым не менш, агрэсіўныя колы заходніх краін, парушаючы нормы міжнароднага права, укрываюць і падтрымліваюць недабітых фашысцкіх генералаў, нават выкарыстоўваюць іх на кіруючых ваенных пасадах у розных агрэсіўных блоках.

Адным з такіх ваенных злачынцаў і катаў з'яўляецца былы начальнік аператыўнага кіраўніцтва генштаба сухапутных сіл фашысцкай Германіі генерал-лейтэнант Адольф Хойзінгер, цяпер старшыня ваеннага камітэта краін НАТО. Хіба можна забыць усе злачынствы, якія ён зрабіў на тэрыторыі краін Еўропы, у тым ліку і на тэрыторыі Савецкага Саюза! Ён з'яўляўся адным з актыўнейшых удзельнікаў распрацоўкі плана «Барбароса» — плана вераломнага нападу на Савецкі Саюз. Гэта ён аддаваў загады ў час вайны аб масавых расстрэлах ні ў чым не вінаватых савецкіх людзей. Ён асабіста вінаваты ў забойстве тысяч беларускіх грамадзян.

Злачынстваў фашысцкіх варвараў не злічыць, як не злічыць усіх чорных спраў, зробленых забойцам Хойзінгерам.

Нельга без агіды думаць, што такая гадзіна распрацоўвае сягоння планы новай вайны, знаходзячыся на пасадзе старшыні ваеннага камітэта краін НАТО.

Ад імя студэнтаў г. Мінска я патрабую аддаць пад суд ваеннага злачынцу Адольфа Хойзінгера!

МІТЫНГ ПРАЦОЎНЫХ МІНСКА

Месца Хойзінгера—на лаве падсудных

(Выступленне А. УС, адказнага сакратара Беларускага Камітэта абароны міру)

Дарагія таварышы!

Нота Савецкага ўрада ўраду ЗША аб адданні пад суд фашысцкага ката Хойзінгера ў нас, беларусаў, выклікае асаблівае адабрэнне.

Хойзінгер зрабіў жахлівыя злачынствы супраць нашай Радзімы. Ён кіраваў аперацыямі гітлераўскіх войск на часова акупіраванай савецкай тэрыторыі. Ён нясе асабістую адказнасць за распрацоўку і вядзенне самых агідных злачынстваў у адносінах да мірнага насельніцтва.

Па прамым загадам Хойзінгера карныя войскі ажыццяўлялі масавае знішчэнне ваеннапалонных, расстрэльвалі заложнікаў, уключаючы жанчын, дзяцей і старых. Гэтым самым ён зрабіў найцяжэйшыя злачынствы супраць чалавецтва.

Савецкі ўрад лічыць неабходным прыцягнуць Хойзінгера да крымінальнай адказнасці за зробленыя ім злачынствы. На падставе дэкларацыі, падпісанай у кастрычніку 1943 года ЗША, СССР і Англіяй, адказныя за забойствы і пакаранні смерцю павінны быць адасланы ў краіны, у якіх былі зроблены іх агідныя дзеянні, для таго, каб яны маглі быць судзімы і пакараны. Зыходзячы з гэтага, Савецкі ўрад чакае, што ўрад ЗША прыме меры да арышту і выдачы савецкім уладам Адольфа Хойзінгера, які знаходзіцца цяпер на тэрыторыі ЗША, для аддання яго пад суд за зробленыя злачынствы.

Савецкія людзі, якія перажылі ўсе жахі вайны: насілле, забойствы, угон у нямецкае рабства, масавае знішчэнне народа — горача падтрымліваюць свой урад і патрабуюць аддаць пад суд ваеннага злачынцу Адольфа Хойзінгера. Гэта ён распрацаваў план вераломнага нападу на нашу краіну і прымянення самага жорсткага насілля супраць савецкіх людзей. Гітлер высока ацаніў свайго вернага прыслужніка, узнагародзіўшы яго вышэйшымі ваеннымі ардэнамі і даверыўшы яму перадаваць ад свайго імя загады і распараджэнні. Гэта акалічнасць ускладае на яго асаблівую адказнасць за ўдзел у зробленых гітлераўскай зграяй злачынствах, і ён павінен панесці за іх справядлівае пакаранне. Ён умеў складаць такія «аператыўныя планы», якія задавальнялі Гітлера.

Па загаду Хойзінгера савецкіх людзей труцілі газам у керчанскіх каменаломнях. У нас, жыхароў Беларусі, да гэтага ката асаблівы рахунак. Па яго загаду былі расстраляны сто мірных жыхароў у верасні 1942 года ў Крупках. Пад выглядам барацьбы з партызанамі была ўчынена расправа над жанчынамі і старымі. Іх выцягвалі з грузавікоў, кідалі ў яму і там расстрэльвалі. Каты не шкадавалі грудных дзяцей. Яны расстралялі жонку афіцэра Савецкай Арміі Фядору Сцяпанаўну Машкарову з шасцімесячным дзіцем.

Пад страхам расстрэлу камендант прымусіў сагнаных жыхароў Крупак прайсці міма ямы і глядзець у яе... А з ямы даносіліся стогны паміраючых.

Хіба гэта можна калі-небудзь забыць! Хойзінгер верна служыў Гітлеру, цяпер ён таксама верна служыць Адэнауэру і імперыялістам Злучаных Штатаў Амерыкі. Ён прызначаны на пасаду старшыні ваеннага камітэта НАТО.

Нота Савецкага ўрада знаходзіцца ў цэнтры ўвагі грамадскасці ўсіх краін. Сумленныя людзі не могуць дапусціць, каб нягоднік, месца якога на лаве падсудных, рыхтаваў новае злачынства супраць чалавецтва.

Пад кожным словам гэтай ноты мы гатовы паставіць свой подпіс, таму што крывёю сваёю і крывёю сваіх блізкіх, вельмі дарагой цаной заплацілі мы за нашу перамогу над фашысцкімі варварамі. Вось і тут у гэтай зале разам з намі знаходзіцца старэйшая дачка Фядоры Сцяпанаўны Машкаровай, расстралянай фашысцкімі катамі па загаду Хойзінгера.

Усе загінуўшыя, усе аддаўшыя свае жыцці звяртаюцца да нас, звяртаюцца да ўсяго чалавецтва: «Пакарайце вінаватых!»

Таварышы! Ад імя Беларускага Камітэта абароны міру, ад імя ўсіх, каму дарагі мір на зямлі, я горача падтрымліваю ноту Савецкага ўрада. Да адказу фашысцкага ката Адольфа Хойзінгера, на руках якога кроў нашага народа!

ДАЛУЧАЮ СВОЙ ГОЛАС

(З выступлення Л. МАШКАРОВАЙ, работніцы грамадскага харчавання)

Таварышы! Я, як і ўсе савецкія людзі, цалкам адабраю патрабаванні Савецкага ўрада аб выдачы савецкім уладам Адольфа Хойзінгера, былога фашысцкага генерала, які знаходзіцца цяпер на тэрыторыі ЗША, для аддачы яго пад суд за зробленыя злачынствы супраць міру і чалавечнасці.

Дакументальнымі матэрыяламі Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванню злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў віна яго даказана поўнасцю.

Мне асабіста давялося назіраць кашмарныя карціны разгулу фашысцкіх карнікаў, узначальваемых Хойзінгерам, на беларускай зямлі.

Ад рук нямецкіх катаў загінула мая маці Фядора Сцяпанаўна Машкарова і маленькая шасцімесячная сястрычка Верачка. Іх выцягнулі з машыны. У маці адабралі Верачку і кінулі ў яму. Услед штурхнулі ў яму і маці. Раздаліся выстралы.

Мне цудам удалося схавацца. Знаходзячыся пад апекай амерыканскіх імперыялістаў і Адэнауэра, генерал-забойца ў сучасны момант верхаводзіць у НАТО. Разам з іншымі недабітымі гітлераўскімі генераламі ён рыхтуе новую вайну супраць міралюбівых і свабодалюбівых народаў.

За ўсе крывавыя злачынствы, зробленыя Адольфам Хойзінгерам, ён павінен быць прыцягнуты да судовай адказнасці!

Я далучаю свой голас да патрабавання ўсіх савецкіх людзей: аддаць Хойзінгера пад суд. Ката — да адказнасці!

МЫ ВЕДАЕМ ЯГО ЗВЯРЫНАЕ АБЛІЧЧА

(З выступлення Л. МІСУНА, расточніка Мінскага аўтамабільнага завода)

Вялікія светлыя перспектывы, адкрыў перад савецкім народам XXII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Мы хочам шчаслівага і радаснага жыцця. Але гэта не падабаецца імперыялістам. Ліхаманкава рыхтуючы новую вайну, яны прызываюць на службу былых гітлераўскіх генералаў. Адзін з іх — Адольф Хойзінгер асталяваўся ў Вашынгтоне ў якасці высокапастаўленага дзеяча НАТО. Беларускі народ добра ведае звярынае аблічча гітлераўскага забойцы. Многія тысячы ні ў чым не вінаватых людзей былі знішчаны па загаду гэтага ката. Ніколі не забыць мне трагедыі ў горадзе Крупкі. У ліку расстраляных па загаду Хойзінгера многіх мірных жыхароў — мая маці і дзве яе сястры.

Калектыў аўтазавода аднадушна патрабуе аддаць пад суд гітлераўскага ката.

Кляймім ганьбай імперыялістаў

(З выступлення А. КРАСОЎСКАГА, работніка выдавецтва)

Жудасныя злачынствы ўчыніў Хойзінгер перад чалавецтвам. Ён асабіста вінаваты ў тым, што былі спалены і сцёрты з твару зямлі дзесяткі савецкіх гарадоў і вёсак. Гэта ён, Хойзінгер, аддаваў загады вешаць, расстрэльваць, знішчаць у душагубках і канцэнтрацыйных лагерах ні ў чым не вінаватых савецкіх людзей. Цяжка, балюча ўспамінаць аб тым, як лютаваў гэты гітлераўскі выкармак на тэрыторыі нашай рэспублікі. Гэта па яго асабістаму загаду ў верасні 1942 года расстралялі сто заложнікаў у Крупках. Сярод гэтых невінаватых ахвяр была і мая жонка.

Цяпер гэты мацёры злачынец, чые рукі ў крыві савецкіх людзей, спакойна расхаджвае па амерыканскай зямлі. Ён выношвае планы новай вайны, планы знішчэння людзей. Але не выйдзе гэта! Мы, савецкія людзі, кляймім ганьбай амерыканскіх імперыялістаў, якія прыкрываюць ваеннага злачынцу Хойзінгера. Мы патрабуем арышту і выдачы савецкаму правасуддзю гітлераўскага ката.

За тысячы абарваных жыццяў

(З выступлення Х. ПРУСЛІНАЙ, пенсіянеркі)

Я — дачка яўрэйскага народа, і я сама перажыла тыя страшэнныя пагромы, якія чынілі гітлераўцы ў акупіраваным Мінску. Ніколі не забыць мне, як з кулямётаў расстрэльвалі натоўпы старых, жанчын і дзяцей, як закапвалі ў ямы жывых разам з мёртвымі. У час гэтых пагромаў загінулі мой муж і сын, а чатырохгадовая дачка была вывезена ў Германію.

Помню, позняй восенню 1942 года акупанты гналі праз горад ад Бетоннага моста па Савецкай вуліцы вялікую калону ваеннапалонных, босых, у лахманах. Цэлы тыдзень, пакуль іх везлі ад лініі фронта, ім не давалі есці. Яны прасілі піць, мінчане хацелі напаіць іх, але фашысты стралялі ў кожнага ваеннапалоннага, які працягваў руку да конаўкі з вадой. Давёўшы да Акадэміі навук, усіх іх расстралялі і нават не дазволілі пахаваць. Трупы ляжалі да вясны.

Ніколі не забыць нам, хто жыў у акупіраваным Мінску, і таго, як на ўсе рэвалюцыйныя і савецкія святы гітлераўцы вешалі нашых людзей на плошчах і вуліцах горада.

Усё гэта рабілася па загаду Хойзінгера і іншых фашысцкіх генералаў. І я думаю, што выкажу думкі ўсіх прысутных у зале, усяго нашага народа, калі скажу:

За нашых замучаных родных, за кроў матак і дзяцей, за тысячы абарваных жыццяў — на шыбеніцу Хойзінгера!

Фашысцкага ката—да адказу!

★ ★

АРЫШТАВАЦЬ І СУДЗІЦЬ ЗАБОЙЦУ

БАРЫСАЎ. Доўгія гады прайшлі пасля выгнання нямецка-фашысцкіх захопнікаў з тэрыторыі Беларусі. Наш народ залячыў раны, якія нанесла вайна. З руін і папялішчаў выраслі фабрыкі і заводы, гарады і вёскі. Але час не ў сілах залячыць душэўныя раны, якія нанеслі нашым людзям гітлераўскія каты ў дні іх часовай акупацыі тэрыторыі рэспублікі.

Неймаверна цяжкія нягоды давялося перажыць і жыхарам горада Барысава. Масавыя расстрэлы ні ў чым не вінаватых людзей, шыбеніцы, здзекі ў засценках гестапа — такі быў «новы парадак», устаноўлены фашыстамі.

Аб гэтым гаварылі на агульнагарадскім мітынгу, прысвечаным ноце Савецкага ўрада ўраду ЗША, якая патрабуе выдачы ваеннага злачынцы Адольфа Хойзінгера савецкаму народу для прыцягнення яго да судовай адказнасці.

У вялікай зале зімовага клуба парку культуры і адпачынку сабралася звыш 700 рабочых і служачых — блізкія і сваякі ахвяр гітлераўскіх катаў, відавочцы крывавай расправы над ні ў чым не вінаватымі савецкімі людзьмі ў верасні 1942 года ў гарадскім пасёлку Крупкі.

На трыбуну падымаецца Валянцін Лізура. Дрыжачым ад хвалявання голасам ён гаворыць:

— У той час мне было 14 гадоў. Але раніцы 2 верасня 1942 года я не магу забыць да гэтага часу. Мяне разам з усім мужчынскім насельніцтвам Крупак і навакольных вёсак выгналі на ўскраіну пасёлка. Ля велізарнай ямы стаялі крытыя ваенныя машыны. І вось з іх пачалі выводзіць старых, жанчын і дзяцей. Усіх кідалі ў яму і там расстрэльвалі.

— Мы патрабуем, — гаворыць у заключэнне Валянцін Лізура, — каб амерыканскі ўрад выдаў нам ваеннага злачынцу Хойзінгера, а не даваў у яго рукі зброі масавага знішчэння людзей. Яго рукі і так у крыві савецкіх людзей.

Уважліва слухаюць удзельнікі мітынгу ўсхваляваную прамову М. П. Цягліка.

— Таварышы! — гаворыць ён.— Бачыце, мая галава зусім белая. Пасівела яна ў верасні 1942 года, пасля расстрэлу савецкіх людзей у Крупках. Я быў міжвольным сведкам гэтай крывавай расправы, учынёнай па загаду генерала Хойзінгера. Ніколі не забуду гэтых злачынстваў. Злачынцу — на лаву падсудных!

Выступае работніца фабрыкі піяніна Эмілія Капыток.

— Скажыце, якую шкоду магла нанесці фашысцкім захопнікам бяззбройная дзесяцігадовая дзяўчынка? — пытаецца яна. — Яны схапілі яе і кінулі ў турму, а потым вывезлі ў лагер смерці Бухенвальд на пакутлівую смерць. Гэтай дзяўчынкай была я. На маёй руцэ і цяпер стаіць лагерны нумар 79667. Цяпер я ведаю, па чыйму загаду здзекваліся з мяне каты. Гэта справа рук Хойзінгера. Як адна з яго ахвяр патрабую ў амерыканскага ўрада арышту і выдачы ката савецкаму правасуддзю. На гэта я маю поўнае права.

З гнеўнымі прамовамі, якія асуджаюць зверствы фашысцкага генерала Хойзінгера, выступілі на мітынгу рабочы аўтарамонтнага завода Іван Кірыльчык, рабочы фанера-запалкавага камбіната Васіль Філіпаў і іншыя.

Удзельнікі мітынгу аднадушна прынялі рэзалюцыю, у якой патрабуюць у амерыканскага ўрада выдачы ката Хойзінгера для прыцягнення яго да суда.

Выкрываюць віцябляне

Віцебскі завод заточных станкоў. Вытворчыя карпусы гэтага буйнейшага ў горадзе прадпрыемства станкабудаўніцтва раскінуліся ўздоўж левага берага Заходняй Дзвіны. У гады вайны тут у адным з падвалаў старога будынка размяшчалася гестапаўская турма. Гэты падвал захаваўся і па сягоннішні дзень. Туды прыходзяць людзі, каб паглядзець надпісы на сценах, зробленыя зняволенымі гестапа — савецкімі людзьмі, асуджанымі на смерць па загаду Хойзінгера. І колькі іх, гэтых надпісаў, выдрапаных пазногцямі, напісаных крывёю! Сюды прыходзяць жыхары горада і вобласці, каб яшчэ і яшчэ раз ушанаваць памяць людзей, замучаных гестапа.

16 снежня 1961 года на заводзе адбыўся многалюдны мітынг, прысвечаны падтрымцы ноты Савецкага ўрада. Першы механічны цэх. У перазменку сюды сабраліся рабочыя многіх цэхаў. Засяроджаныя, з сурова ссунутымі бровамі, яны слухаюць кароткі расказ старшыні заводскага камітэта прафсаюза Ярушэвіча, які адкрыў мітынг, аб злачынствах былога фашысцкага генерала Адольфа Хойзінгера.

— Гэты кат, — гаворыць Ярушэвіч, — уцёк ад справядлівага пакарання савецкага народа, ласля сканчэння вайны. Але ён не ўцячэ ад гэтага пакарання зараз. Я заклікаю вас падтрымаць рашэнне Савецкага ўрада аб перадачы суду ваеннага злачынца, які хаваецца зараз у Злучаных Штатах Амерыкі.

Да трыбуны падыходзіць рабочы завода Завілевіч.

— Прашу слова! — гаворыць ён. — Я ўжо не малады чалавек. Але, можа быць, зараз я выглядаў бы лепш, каб не Адольф Хойзінгер. Па яго загаду я быў заключаны ў фашысцкі лагер Дахау. Я сваімі вачыма бачыў там, як фашысты расстрэльвалі людзей, як удзень і ўначы с печаў гэтага лагера ішоў чорны дым. Гэта гарэлі вязні, кінутыя туды жывымі. Мне цудам удалося выратавацца ад гібелі. Вось што такое Адольф Хойзінгер! Ён вінаваты ў гібелі многіх людзей. Яго рукі ў крыві ахвяр. Гэты кат павінен быць на лаве падсудных!

Слова просіць рабочы-качагар Ячменеў. Ён стаіць перад усімі ў рабочай спяцоўцы, з яшчэ не памытымі пасля работы рукамі.

— Я не бачыў сваімі вачыма гэтага фашысцкага генерала,— гаворыць ён.—Калі ён быў на тэрыторыі нашай вобласці, я тады знаходзіўся ў партызанскім атрадзе. І генерал таксама не ведае мяне; але ён павінен памятаць партызан бацькі Міная. Бо супраць гэтага атрада, супраць нас, народных мсціўцаў, фашысцкі кат Хойзінгер пасылаў карныя атрады. Але гэтыя атрады нічога не маглі зрабіць з партызанамі, былі бяссільныя. Яны былі смелыя толькі супраць бяззбройных мірных жыхароў акупіраваных фашыстамі вёсак. Па загаду Хойзінгера яны знішчалі грамадзянскае насельніцтва. Я сам бачыў трупы расстраляных карнікамі дзяцей, старых і жанчын.

У мяне ў вайну загінула два родныя і пяць дваюрадных братоў. Я не магу дараваць гэтага. Я патрабую справядлівага суда над Хойзінгерам.

Гэтага патрабуе і другі выступаючы, былы партызан брыгады бацькі Шмырова, цяпер галоўны канструктар завода Шацілаў.

— Нельга спакойна гаварыць аб зробленых гэтым катам злачынствах супраць чалавецтва. Бо ён, гэты самы Адольф Хойзінгер, асабіста распрацоўваў планы зладзейскага нападу гітлераўцаў на нашу краіну. Ён сам і ажыццяўляў іх. Судзіць яго, абавязкова!

Аднадушным падняццем рук удзельнікі мітынгу прынялі рэзалюцыю, у якой гаворыцца, што калектыў завода, як і ўвесь савецкі народ, падтрымлівае ноту Савецкага ўрада ўраду ЗША аб выдачы ваеннага злачынцы Адольфа Хойзінгера для прыцягнення яго да адказнасці па дзеючаму міжнароднаму пагадненню.

Не забудзем, не даруем

КРУПКІ. Крывавыя справы ваеннага злачынцы Адольфа Хойзінгера добра памятаюць жыхары Крупскага раёна. Гэты гітлераўскі выкармак загадаў расстраляць летам 1942 года непадалёку ад раённага цэнтра сто мірных жыхароў, галоўным чынам, жанчын, дзяцей і старых.

15 снежня ў гарадскім пасёлку Крупкі адбыўся многалюдны мітынг. Выступаўшыя на ім мясцовыя жыхары з абурэннем гаварылі аб крывавых злачынствах гітлераўскага ката і забойцы Хойзінгера і аднадушна адабралі ноту ўрада СССР ураду ЗША аб выдачы ваеннага злачынцы савецкім уладам для аддання яго пад суд.

— Мы ніколі не даруем і не забудзем крывавых спраў ката, — гаворыць пенсіянер Павел Сцяпанавіч Каралькоў. — Я быў сведкам крывавага пабоішча, якое ўчынілі тут гітлераўцы па загаду Хойзінгера 2 верасня 1942 года. Раніцай гэтага дня з пяці сельсаветаў — Нацкага, Шайкоўскага, Баброўскага, Жаберыцкага і Крупскага нас сабралі і павялі пад узброенай аховай на ўскраіну раённага цэнтра. Там каля свежавыкапанай ямы стаяла трыбуна, з якой камендант аб'явіў, што расстраляе сто чалавек за напад партызан на станцыю Слаўнае. На нашых вачах гэтыя людзі былі забіты. Тых, у каго было добрае адзенне, распранералі. Сярод расстраляных была жанчына з грудным дзіцем па прозвішчу Позняк. Былі расстраляны таксама дзве маленькія дзяўчынкі гадоў дзесяці-адзінаццаці, прозвішчаў іх не ведаю. Я, як і ўсе савецкія людзі, горача падтрымліваю ноту Савецкага ўрада аб выдачы нашым уладам генерала Хойзінгера для аддання яго пад суд.

На мітынгу выступілі таксама сведкі гэтага крывавага злачынства Віктар Фаміч Шэршань — тэхнік Крупскага лясніцтва, Мікалай Васільевіч Іваноў — пенсіянер і іншыя.

Удзельнікі мітынгу аднадушна прынялі рэзалюцыю, у якой патрабуюць выдачы Хойзінгера.

Ніякай літасці фашысцкаму выкармку

ТАЛАЧЫНО. Буйныя, быццам гарошыны, слёзы каціліся па твары Ніны Жукоўскай. І ў каго з тых, хто слухаў яе, не здрыганулася сэрца, не сціснуліся ад гневу кулакі. Ніна Пятроўна Жукоўская расказвае аб жудасных злачынствах, здзейсненых нямецка-фашысцкімі варварамі на зямлі яе бацькоў, у яе родным Слаўным. Гэта па прамому загаду Хойзінгера паўжывым быў закапаны ў зямлю муж Ніны Жукоўскай Раман Гайсёнак.

Гэта па загаду Хойзінгера была расстраляна настаўніца Валянціна Часловіч, да паўсмерці былі збіты бацька і маці Міхаіла Кулакоўскага, была выразана цэлая сям'я Катовічаў.

Хіба ж могуць людзі жыць спакойна, калі фашысцкая гадзіна не толькі не пакарана, але падымае галаву? Гнеўныя словы гучаць на мітынгу ў Талачыне.

— Ніякай літасці выкармку фюрэра! — патрабаваў былы партызан В. Паўлоўскі.

— Адольфа Хойзінгера даўно чакае лава падсудных. Трэба, каб ён хутчэй заняў на ёй сваё месца, — заявіў настаўнік А. Ішукоў.

— Я не магу забыць двух маіх сыноў, якія загінулі ў барацьбе з фашызмам. Я не магу дараваць злачынстваў Хойзінгеру. Пад суд яго! — з душэўным болем гаворыць пенсіянер П. Латушкін.

Так, самага суровага пакарання заслугоўвае гэты звер у чалавечым абліччы. І дарэмна сёння тыя, што кормяць і поюць Хойзінгера, распінаюцца аб нейкім гуманізме і чалавекалюбстве крумкача і ваўкалака. Яны сцвярджаюць, што сам Хойзінгер не страляў. Толькі не, ім не ўдасца нікога ашукаць, бо людзі ведаюць: забойца не толькі той, хто забівае сам, але і той, хто ўкладвае зброю ў рукі забойцаў, хто адае загады забіваць. Рукі і мундзір Хойзінгера заліты крывёю многіх савецкіх людзей.

На мітынгу ў Талачыне была прынята рэзалюцыя, якая патрабуе выдачы Хойзінгера савецкаму ўраду і аддачы яго пад суд.

Аднадушная воля мінчан

(Рэзалюцыя працоўных горада Мінска)

Мы, прадстаўнікі працоўных горада Мінска, сабраўшыся на агульнагарадскі мітынг, аднадушна адабраем патрабаванне Савецкага ўрада аб выдачы савецкім уладам былога фашысцкага генерала гітлераўскай Германіі Адольфа Хойзінгера, які знаходзіцца цяпер на тэрыторыі ЗША, для перадачы яго пад суд за зробленыя ім злачынствы супраць міру, ваенныя злачынствы і злачынствы супраць чалавечнасці.

Дакументальнымі матэрыяламі Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па ўстанаўленню і расследаванню злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў неабвержна даказана, што Хойзінгер, займаючы кіруючыя пасады ў камандаванні гітлераўскага вермахта, прымаў непасрэдны ўдзел у плававанні, падрыхтоўцы і ажыццяўленні агрэсіі фашысцкай Германіі супраць Савецкага Саюза, Англіі, Югаславіі, Францыі, Грэцыі і іншых еўрапейскіх краін.

Асабліва цяжкія злачынствы Хойзінгер зрабіў супраць нашага народа, калі ён з жніўня 1942 года ўзначаліў карныя аперацыі гітлераўскіх войск на часова акупіраванай савецкай тэрыторыі.

Матэрыялы Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі ўваскрашаюць у нашай памяці кашмарную карціну разгулу фашысцкіх карнікаў, якімі кіраваў Хойзінгер, і на беларускай зямлі.

Па прамых загадах Хойзінгера карныя войскі ажыццяўлялі масавае знішчэнне ваеннапалонных і партызан, расстрэльвалі заложнікаў, уключаючы жанчын, дзяцей, старых, палілі вёскі і сёлы.

Беларускі народ, як і ўвесь савецкі народ, цяпер упарта працуе над ажыццяўленнем велічнай праграмы будаўніцтва камунізма, прынятай гістарычным XXII з'ездам партыі. Мы думаем аб светлым будучым — камунізме, працуем у імя яго. Але мы ніколі не забудзем тых крывавых злачынстваў, якія зрабілі фашысцкія каты над савецкімі людзьмі.

Знаходзячыся пад апекай амерыканскіх імперыялістаў і хеўры Адэнауэра, генерал-забойца ў сучасны момант верхаводзіць у агрэсіўным блоку НАТО. Разам з іншымі недабітымі гітлераўскімі генераламі ён рыхтуе новую вайну супраць свабодалюбівых народаў.

За ўсе крывавыя злачынствы, зробленыя Хойзінгерам, ён павінен быць прыцягнуты да судовай адказнасці.

Удзельнікі мітынгу аднадушна падтрымліваюць і адабраюць ноту Савецкага ўрада ўраду ЗША аб выдачы Хойзінгера для справядлівага суда і пакарання.

Ката — да адказнасці! Такая аднадушная воля працоўных горада Мінска!

Ратуюць вельмі ўжо заўзята
Злачынцу заправілы з НАТО.

Відаць, у іх вялікі попыт
На тых, хто мае «ўсходні вопыт».

Савецкі народ патрабуе: фашысцкага ката — да адказу!

(Пачатак на 2-3 стар.)

КРЫВАВЫ ГЕНЕРАЛ

Расказваюць цудам уцалеўшыя

НОЧ БЫЛА НА ЗЫХОДЗЕ. МОЦНА СПАЛІ СТОМЛЕНЫЯ ЛЮДЗІ І НЕ ВЕДАЛІ, ШТО ЯНЫ ЎЖО АСУДЖАНЫ. 19 ЛЮТАГА 1943 ГОДА ІМ БЫЎ ПАДПІСАНЫ СМЯРОТНЫ ПРЫГАВОР.

У перадсвітальную цішыню здалёк уплятаецца якісьці незразумелы гук. Нібы назойліва гудзе велізарная жалезная муха. Яна павольна паўзе па заснежанай дарозе. За ёй другая... трэцяя... дзесятая...

Вось яны спаўзаюць з бальшака і чорнымі струменьчыкамі расцякаюцца па сонных вуліцах чарнігаўскага гарадка Карукоўкі, ахопліваюць яго кольцам.

У неба ўзлятае ракета, і ў гэты ж момант успыхваюць сотні факелаў. Людзі ў чорных шынялях з эмблемай смерці на рукаве хлынулі з грузавікоў і рассыпаліся па вуліцах і завулках.

Слесар рафінаднага завода Рымар узняў галаву, прыслухаўся. Непадалёку раздалася аўтаматная чарга, пачуліся крыкі, дзіцячы плач, зазвінелі шыбы. У пакоі раптам стала светла. Над суседнім домам успыхнула полымя.

Рымар кінуўся будзіць сям'ю:

— Адзявайцеся!

Але ўцячы не ўдалося — горад ачапілі гітлераўцы. Сотні мірных жыхароў Карукоўкі былі арыштаваны эсэсаўцамі. Людзей выстраілі ля рэстарана. Доўгая шарэнга прадстаўляла страшную чаргу — чаргу на смерць...

Было гэта ў сакавіку 1943 года.

— У рэстаран нас уводзілі па некалькі чалавек, — расказвае Яўгеній Яфімавіч Рымар.— Жонка і двое старэйшых дзяцей стаялі перада мной. Калі іх павялі, малодшая, Ніна, кінулася ўслед за маці. Эсэсавец адштурхнуў яе прыкладам. Дзяўчынка заплакала. Я ўзяў яе на рукі.

Выстралы... Крыкі... Вось і я з Нінай на руках паднімаюся па прыступках ганку.

Паліцай стаяў на буфеце. Ён ускінуў аўтамат. Куля трапіла мне ў вока. Я паваліўся і выпусціў з рук Ніну. Паліцай прашыў яе чаргой з аўтамата. Другая куля трапіла мне ў шыю, трэцяя — у жывот, і я згубіў прытомнасць.

Калі расплюшчыў вочы, было шэсць гадзін вечара, на сценцы цікаў гадзіннік. Чую, нехта плача. Глянуў: дзве старыя стаяць над гарой трупаў, шукаюць сваіх. Я падаў голас. Старыя спалохаліся і... уцякаць.

— Не лякайцеся! То ж я... Рымар.

— А дзе ты е?

— Тутачка... Дапамажыце мне.

Ледзь дацягнуўся да хаты нявесткі. Яна была дома. Паклала мяне на печ і кажа:

— Дзеці твае ўсе перабіты, а жонка жывая з рэстарана выпаўзла. Яе кулі лёгенька закранулі.

Набрала нявестка ў склепе павуціння, заляпіла мае раны, рушнікам іх абматала. А я зноў без памяці паваліўся.

Праз двое сутак гітлераўцы пайшлі. А ад нашай Карукоўкі засталіся адны галавешкі ды некалькі такіх, як я, недабітых.

У другім канцы Чарнігаўшчыны, у вялікім сяле Казары Носаўскага раёна, таксама нічога не ведалі аб страшэнным загадзе. А да сяла ўжо набліжалася смерць.

Васемнаццаць год прайшло з таго страшнага дня, а заплюшчу вочы — вось як наяве бачу, — ціха расказвае Мар'я Рыгораўна Якавенка. — Мне ў той час 12 год зраўнялася. Хата наша была крайняя. З прыгорка ўсё сяло, як на далоні. Глянула я — і ногі падкасіліся. Па ўсяму сялу — машыны. На перакрыжаваннях кулямёты расстаўлены і фашыстаў безліч.

Гляджу, гоняць па завулку людзей. Хто адзеты, а хто проста так, у ніжняй бялізне і босыя. Загналі іх у суседнюю хату і дзверы за імі зачынілі. Чую: бах! бах! Хачу бегчы, а ногі не ідуць. Бачу, фашысты да нас накіроўваюцца. А адзін з іх, такі насаты, суседкін шалік пуховы на хаду ў кішэню піхае. Потым ускінуў аўтамат і па нашаму дому.

Мы ўсе задамі, па аднаму да бальшака на Носаўку падаліся. А там гітлераўцы. Схапілі нас. Бацька вырваўся, уцёк, а нас загналі ў хлеў. Паліцаі паставілі перад дзвярыма кулямёт і ўсіх пастралялі. Маці, браціка, сястру Галю. А я жывая засталася. Бачу, бацьку гоняць. Я да яго бягом. А кулі... жык... жык... толькі ўсе міма.

Прыціснулася я да бацькі, плачу, дрыжу. А ён увесь белы, як папера.. Тут паліцаі нас абодвух у хлеў заштурхнулі і пачалі ў натоўп з кулямёта паліць. Бацька мяне сабою накрыў. Спіну яму прастрэлілі. Ён адпоўз убок і кажа:

— Хавайся, доню, у салому...

Закапалася я ў салому і ляжу, а побач са мной брацік дваюрадны, Федзя, у плячо ранены.

Паліцаі думалі, што ні аднаго ў жывых не засталося. Яны пайшлі. Бацька нас угаворваць:

— Уцякайце, — кажа, — уцякай, дзіцятка! — Хоць вы застанецеся жывыя.

Начавалі мы ў полі пад сціртай. Уночы Федзя ўсё піць прасіў, а пад раніцу заціх. Я прачнулася, стала яго будзіць, а ён — халодны.

Закрыла я яго саломай і пайшла. Да вечара дайшла да суседняга сяла і ля ваколіцы, як сноп, павалілася.

Чужыя людзі мяне падабралі і выхадзілі.

Ведайце ж, людзі, што ў Карукоўцы і Казарах было спалена больш за дзве тысячы дамоў. Там было забіта звыш дзесяці тысяч жыхароў, старых, жанчын і дзяцей. І гэта было зроблена па загаду генерала Хойзінгера, начальніка аператыўнага аддзела гітлераўскага генштаба. Гэта ён падпісаў 19 лютага 1943 года крывавы загад. Хойзінгер асабіста кіраваў барацьбой па падаўленню партызанскага руху. Ён камплектаваў карныя часці, ім былі створаны «ягкаманды», спецыяльнай задачай якіх было «паляванне на партызан» і расправа з мірным насельніцтвам. Гэта ён санкцыяніраваў расстрэлы заложнікаў. Гэта па яго загаду душылі газамі жанчын, дзяцей і старых, якія хаваліся ў керчанскіх каменаломнях. Свае злачынствы ён здзяйсняў разам з тымі, хто быў асуджаны на судзе ў Нюрнбергу.

Тады яму ўдалося пазбегнуць справядлівага пакарання. Але цяпер справядлівы суд павінен адбыцца. Да адказу ката і забойцу!

Лідзія ЛЯСНАЯ.

Карукоўка-Казары.



Мінск. Туманны дзень над Свіслаччу.
Фотаэцюд В. Лупейкі.

ПАЧАК ЗАПАЛАК

Шырокі рынак спажыўцоў беларускіх запалак, імі карыстаецца амаль уся Украіна. Асноўным пастаўшчыком гэтай прадукцыі для братняй суседняй рэспублікі з'яўляецца Барысаўскі фанерна-запалкавы камбінат. Ён размешчаны на беразе Бярэзіны. Раней гэты бераг быў неабжыты, пусты, а цяпер тут адно прадпрыемства прымыкае да другога.

Ад старых драўляных будынкаў фабрыкі цяпер і следу не засталося. Усё тут пабудавана нанова, у вытворчых карпусах прасторна, светла, а багацце зеляніны каля запалкавых машын, дзе клеяць пачкі, радуе вока і аблягчае дыханне. Здаецца, што цэх знаходзіцца ў незвычайнай аранжарэі.

Калісьці выпуск запалкавых пачкаў абмяжоўваўся дзесяткамі, потым сотнямі штук, а цяпер адсюль прадукцыя ідзе патокам — тысячамі, дзесяткамі тысяч скрынак. І вытворчасць усё пашыраецца. Цяпер саломку наразаюць машыны, ператвараюць яе ў запалкі таксама машыны. Механізавана і склейка пачкаў. Век ручной працы даўно скончыўся. Усё больш паточных ліній па праву займаюць сваё месца ў фабрычных карпусах.

Але якімі б ні былі бездакорнымі механізмы і колькі б іх ні стаяла ў рад пад фабрычнымі дахамі, без умелых рабочых рук тэхніка сама па сабе існаваць не можа. Ёю трэба кіраваць, ёй патрэбен гаспадар.

Гаворачы аб людзях гэтага прадпрыемства, перш за ўсё хочацца адзначыць сям'ю Уладзіміра Ждановіча. Лёс гэтага чалавека і членаў яго сям'і некалькі незвычайны. Уладзімір Ждановіч доўгі час жыў у Францыі. Аднак там ён не знайшоў свайго шчасця і ў 1947 годзе зноў вярнуўся на Радзіму.

Фанерна-запалкавы камбінат тады толькі аднаўляўся, і Ждановіч разам са сваёй сям'ёй адразу ж уключыўся ў працоўнае жыццё прадпрыемства. Зараз галава сям'і пайшоў на пенсію. На фабрыцы засталіся яго сыны і іх жонкі, яго дочкі і іх мужы. А ўсяго на камбінаце зараз працуе каля дзесяці чалавек з гэтай сям'і. Сын Уладзіміра Ждановіча — Іван працуе на апошняй аперацыі і рыхтуе да адпраўкі ўжо гатовую прадукцыю. Ён забівае скрынкі. Жонка Івана працуе намазчыцай пачкаў. Дочкі Уладзіміра Уладзіміравіча — Марыя і Роза склейваюць пачкі. Віктар — электраманцёр, яго жонка — старшы кантралёр. Георгій Ждановіч — слесар. Яго жонка таксама на камбінаце, яна працуе майстрам. Робяць запалкі яшчэ два маладыя Ждановічы — Мікалай і Лілія.

Такім чынам, у тых барысаўскіх запалках, якімі штодзённа карыстаюцца людзі, закладзена немалая праца членаў сям'і Уладзіміра Ждановіча.

У той дзень, калі я быў на камбінаце, рабочыя абмяркоўвалі новую этыкетку для запалак, прысвечаную пакарыцелю космасу Юрыю Гагарыну. Калекцыі этыкетак, якія налічваюць некалькі дзесяткаў тысяч, няспынна папаўняюцца новымі экземплярамі. Яны нібы расказваюць доўгую і цікавую гісторыю барысаўскага пачка запалак, таго пачка, які добра ведаюць многія савецкія людзі.

Я. САДОЎСКІ.

АТРЫМАЎ ПА ЗАСЛУГАХ

Эйхман прыгавораны да павешання

ІЕРУСАЛІМ. Акруговы суд Іерусаліма прыгаварыў да пакарання смерцю праз павешанне нацысцкага ваеннага злачынцу Адольфа Эйхмана — шэфа яўрэйскага аддзела гестапа.

Выбраўшыся ў 1946 годзе невядома як з амерыканскага лагера для ваеннапалонных, гэты фашысцкі забойца 15 год хаваўся ад правасуддзя.

Патрабаванні Вашынгтона і Бона не дапусціць ператварэння суда над Эйхманам у суд над нацызмам і яго паследышамі зрабілі ўплыў. Ізраільскія ўлады зрабілі ўсё, каб паказанні Эйхмана, які, несумненна, ведаў вельмі многа, не датычыліся многіх кіраўнікоў ФРГ, такіх жа закаранелых ваенных злачынцаў.

Эйхман прадстаў на судзе, як адзін з адказных выканаўцаў і кіраўнікоў нацысцкай машыны чалавеказнішчэння; неабвержна даказана, што Эйхман быў непасрэдным арганізатарам знішчэння мільёнаў людзей у лагерах смерці — Асвенціме і Трэблінку, Берген-Бельзене і Майданеку, Хелма і Сабібуры. Адзіным пакараннем для Эйхмана, заявіў пракурор Гідэон Хаузнер, можа быць смерць. «І нават калі б яму давялося паміраць тысячу разоў у дзень, гэта была б толькі нязначная частка таго, што ён заслугоўвае».

Навучылі дзяцей спяваць рускія песні

Гэтым летам разам з мужам і дзецьмі я жыла ў дзіцячым аздараўленчым лагеры, арганізаваным па ініцыятыве Камуністычнай партыі Францыі. Тут адпачывалі галоўным чынам дзеці шахцёраў. У калоніі, як тут называюць лагер, было 230 дзяцей, а нас, абслуживаючых іх, толькі пяць жанчын і чатыры мужчыны.

Мы ўсе працавалі бясплатна, толькі б нашы дзеці дыхалі чыстым паветрам у гарах. Дзеці нас палюбілі. Разам з нашай суайчыннікай Е. В. Стулішайка мы навучылі іх спяваць рускія песні. Зараз ад усіх дзяцей мы атрымліваем многа пісем.

М. КАЛБАСІНСКАЯ.

Францыя.

Коратка

З кожным днём прыгажэе жыццё працоўных Бярэзінскага раёна, паляпшаецца дабрабыт, павышаецца культурны ўзровень, растуць даходы кожнай сям'і. Варта пабываць у любой хаце рабочага ці калгасніка, каб у гэтым пераканацца.

Нікеляваныя ложкі і мяккія канапы, швейныя машыны і матацыклы, радыёпрыёмнікі і тэлевізары, шафы і люстры — гэта звычайныя рэчы дамашняй абстаноўкі кожнай сям'і. Толькі ў гэтым годзе магазін культтавараў, што знаходзіцца ў Беразіно, прадаў 52 матацыклы розных марак, 1.047 веласіпедаў, 312 радыёпрыёмнікаў, 63 тэлевізары.

У апошні час тэлевізары набылі закройшчык швейнага цэха праўкамбіната Ігнат Барысевіч, рабочы аўтабазы Георгій Вырвіч, пенсіянер Якаў Лапа і іншыя.

П. НЕСЦЯРОВІЧ.

РАДЫЁ

ДЛЯ ЗАХОДНЯЙ ЕУРОПЫ

Слухайце штодзённа нашы радыёперадачы па сярэднееўрапейскаму часу: на сярэдняй хвалі 227 метраў (ці 1 322 кілагерцы) з 6 да 7 гадзін, з 16.00 да 17.00 і з 21.00 да 21.30;

на кароткай хвалі 30,83 метра (ці 9730 кілагерцаў) з 6 да 7 гадзін.

Па нядзелях: на хвалях 30,83 метра і 227 метраў з 6 да 9 гадзін і з 10 да 13 гадзін;

на сярэдняй хвалі 227 метраў з 16.00 да 17.00 і з 21.00 да 21.30.

НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Па нядзелях — ад 8 гадзін да 8 гадзін 30 мінут па сярэднееўрапейскаму часу на хвалі 30,83 метра (ці 9730 кілагерцаў) і на сярэдняй хвалі 227 метраў.

ДЛЯ ЗША І КАНАДЫ

Слухайце штодзённа нашы радыёперадачы па нью-йоркскаму часу з 19.30 да 20.30 на хвалях: 31,04 метра (ці 9665 кілагерцаў), 31,23 метра (ці 9605 кілагерцаў), 41,15 метра (ці 7290 кілагерцаў).

НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Па суботах — ад 20 гадзін да 20 гадзін 30 мінут па нью-йоркскаму часу на кароткіх хвалях: 31,04 метра (ці 9665 кілагерцаў), 31,23 метра (ці 9605 кілагерцаў), 41,15 метра (ці 7290 кілагерцаў).

НАШ АДРАС

Мінск, Ленінскі праспект, 77. Дом друку, пакой № 20. Для пісьмаў: Мінск, паштовая скрынка № 14.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.